**Кароткі  змест Паэзія**

**Кароткі  змест Прысяга над крывавымі разорамі**





**Кароткі змест Паэзія**

Невялікая па аб'ёму паэтычная спадчына Цёткі тэматычна і жанрава досыць разнастай ная . Цётка магла быць глыбока лірычнай,  унутрана засяроджанай, бачыць хараство прыроды, сумаваць па роднай старонцы. У  іншых яе вершах чуваць шум буры, якая сімвалізуе народную рэвалюцыю, гучыць  палкі заклік да змагання.

Вершы «Хрэст на  свабоду», «Вера беларуса», «Мора», «Добрыя весці», «Суседзям у няволі»  з'явіліся як водгук на падзеі першай рускай пралетарскай рэвалюцыі. Напісаныя ў  1905—1906 гг. творы выяўляюць адчуванні паэткі ў сувязі з развіццём  рэвалюцыйных падзей.

«Хрэст на свабоду»,  самы ранні па часе напісання сярод названых твораў, распаўсюджваўся як  пракламацыя. У ім знайшлі адбітак рэальныя падзеі — расстрэл мірнай  дэманстрацыі ў студзені 1905 г., называюцца канкрэтныя гістарычныя асобы.

У Пецярбурзе змерлі людзі: Ім прашылі куляй грудзі, Бо то з песняй і алтарам Пайшлі з папом перад царам.

А цар сыпнуў, як бы з неба Тысяч куляў...

Цётка паказала, як рушылася вера ў добрага цара, канчалася народнае цярпенне.

Дурняў хрысцяць на свабоду

Цар навуку даў народу.

Выступаючы за свабоду і роўнасць ўсіх народаў, паэтка не забывалася на свой.

Веру, братцы: людзьмі станем,

Хутка скончым мы свой сон;

На свет божы шырэй глянем,

Век напіша нам закон.

У гэтых радках верша «Вера беларуса» адлюстраваны спадзяванні, якія ўскладвала Цётка на рэвалюцыю. Рэвалюцыя, даўшы моцны штуршок нацыянальнаму адраджэнню, мелася прынесці вялікія змены ў гістарычным лесе беларусаў. Аўтар гаворыць, што народ чакае іх і гатоў змагацца за новае, людскае жыццё:

Мы не з гіпсу, мы — з камення,

Мы — з жалеза, мы — са сталі,

Нас кавалі ў пламенні,

Каб мацнейшымі мы сталі.

Цяпер, братцы, мы з граніту,

Душа наша з дынаміту,

Рука цвёрда, грудзь акута.

Заканчваецца верш заклікам «парваць пута!» «Мора» мае падзагаловак «Рэвалюцыя народная», тым самым Цётка падкрэслівала адназначнасць прачытання сімвалічных вобразаў у творы — мора, смока, бога, бітвы і інш. Праз апісанне мора паэтка перадавала ўздым, напал рэвалюцыйных падзей:

...Цяпер бурна, страшна мора!

Хваля поўна дзікіх дум.

Мора вуглем цяпер стала,

Мора з дна цяпер гарыць,

Мора скалы пазрывала,

Мора хоча горы змыць.

Мора парушыла «святы сон» бога (цара): «...трон дрыжыць, не спяць прарокі, бог склікае святы сход». Сышліся дзве сілы — народ і царызм.

Бой пачаўся. Войска бога

Залпам паліць ў горды хвіль...

Растуць сілы мора злога,

У размаху відзен гарт;

Не адступяць войскі бога...

Бой пачаўся не на жарт.

Цётка паэтызуе і ўзвышае рэвалюцыю:

Такі бой вякамі жджэцца,

Такі бой гігантаў дасць,

У такім бою толькі грэцца,

У такім бою толькі пасць.

Як і ў вершы «Мора», у «Добрых весцях» выявіліся адчуванні паэткі ў самы пік рэвалюцыйнага змагання. Народ узняўся, рашуча і смела пайшоў на барыкады.

І матка сына даць нам гатова,

І жонка мужа вышле ў агонь —

піша Цётка. Перамога над царызмам здавалася магчымай і блізкай:

...Нясуцца весці

Ужо граюць маршы там на ўсходзе;

Над кожнай хатай, у кожным месцы

Шчабечуць птушкі нам а свабодзе.

Разам з тым паэтка разумела, што змаганне будзе нялёгкае («Важну афяру прыйдзецца даць»), каб «на небе сонца шчасця» узышло, «патрэбна хмары прагнаць».

Верш «Суседзям у няволі» іншы па праблематыцы і пафасу. Рэвалюцыя пацярпела паражэнне, ідзе расправа над яе ўдзельнікамі. Таму лірычная гераіня «ад сваіх хат, ад сваіх ніў», нясе «слязу і стогн», нясе «нагаек царскіх звон».

На радзіме ноч, братоў яе катуюць.

Звяртаючыся да суседзяў, яна заклікае быць разам, працягнуць руку яе народу:

Мы вам родны. Праўду знайце:

Ці у долі, ці ў нядолі —

З вамі станем ў адным полі,

Рука ў руку з вашым братам

За свабоду перад катам.

Любоўю да свайго народа і роднай зямлі прасякнуты вершы «Мае думкі» і «З чужыны».

Паэтка хацела б «зярном пшаніцы... упасць на ніўкі вёскі» з тым, каб у простага люду

быў «хлеб смачнейшы трошкі». Хацела «рэчкай быстрай аббегчы родны край». Аднак на гэтай спакойнай лірычнай інтанацыі страсная парывістая натура Цёткі доўга ўтрымацца не можа. Яе рэчка пачынае «агнём кіпець у дне», хоча дастаць хваляй да неба, «украсці сонца, ізноў спусціцца й больш света людзям даць». У «Маіх думках» гучыць водгулле нядаўняй рэвалюцыі. Абярнуўшыся ветрам, лірычная гераіня твора праляціць над светам, закруціцца «цёмным віхрам» і як крэсівам стукнецца ў зоры. Зоркі і месяц пакліча на суд, бо

У нас цёмна, край наш хмурны,

Ад цямноты людзі спяць.

Я там біўся, я там віўся,

Я ім хаты паламаў,

А ўсё ж такі не дабіўся,

Каб народ свой голас даў!..

У апошніх радках верша — няспраўджаныя рэвалюцыяй надзеі на адраджэнне народа.

Жыццё на чужыне зведалі па тых ці іншых прычынах многія беларускія пісьменнікі як далёкага мінулага, так і даўняга. Тэму тугі па роднай старонцы можна назваць скразной у літаратуры XX ст. Пачынала яе палітычная эмігрантка Алаіза Пашкевіч.

І душна, і цесна, і сэрца самлела

Мне  тут на чужыне, здалёк ад сваіх...

— скардзіцца паэтка ў  вершы «З чужыны». Яна гатова птушкай, «расінкай на хмары» ляцець туды, «дзе  пацеркай

белай Вілля прабягае,  дзе Вільня між гораў гняздо сабе ўе». Вобраз радзімы, які носіць у сэрцы  паэтка, не толькі лясы, дарогі, палеткі, але і «бледныя твары», пануры спрацаваны люд са смуткам у вачах. Усім ім аўтар верша жадае, «каб жыць... было  ў гэтым годзе лягчэй».

істотных змен у жыцці.  У апавяданні яны ўвасоблены ў вобразах сыноў Мацея — рабочага, салдата і  парабка. Цётка разумела, што рэвалюцыя патрабуе ахвяр, змаганне за сацыяльную  справядлівасць лёгкім не бывае. Таму Мацей бачыць поўныя крыві разоры...

Апавяданне «Прысяга над  крывавымі разорамі» распаўсюджвалася ў якасці пракламацыі.

**Кароткі  змест Прысяга над крывавымі разорамі**

Цёплым асеннім днём «ледзьве-ледзьве поўз стары Мацей у поле». Тры яго сыны былі не дома і ён не спраўляўся без дапамогі на сваім вузкім кліне зямлі. Адпрацаваўшы багатым суседзям за даўгі, ён першы дзень выйшаў сеяць.

Знясілены, стомлены заснуў.

Сніў ён, што сабралася многа народу на яго полі. Усе крычалі: «Вузка! Цесна! Мала!» Мацей таксама «стаіць пасярод гэтага народу».

Выбягае сусед Астап і мацней за Мацея крычыць: «А скуль узяць?»

Народ паказвае на нівы, лясы, палі.

Астап пярэчыць, што гэта казённае, дворнае, не дадуць яго, няма права.

«З цьмы народу» выходзяць тры сыны Мацея: «парабак дворны, салдат і работнік пецярбургскі і становяцца на кален! і прысягаюць громка, ясна, паволі:

— Мы дамо! Мы — сіла! Мы — права!»

Потым Мацею здаецца, што ўсё спавіў туман: толькі разоры стаяць поўны крыві, а над імі вісяць тры скрыжаваныя далоні... І раздаецца ціха ясны голас:

— Мы — сіла! Мы — права!..»

**Мастацкія асаблівасці**

Апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» надрукавана ў № 1 «Нашай долі», першай легальнай беларускай газеты. Алегарычным сном старога Мацея Цётка давала адказ на адно з асноўных пытанняў жыцця народа — пытанне пра зямлю. Аддаць зямлю селяніну — гэтага чакала ад рэвалюцыі вёска, ідучы на змаганне з царызмам. Цётка называла тыя сілы, якія, аб'яднаўшыся, змогуць дамагчыся.